“Памажы нам, божа” з’яўляюцца яскравым прыкладам вясенніх загукальных напеваў з выкарыстаннем шырокіх адкрытых спеваў у грудным рэгістры.

Авалодванне народна-песенным выкананнем немагчыма без разумення светапогляду і тых адчуванняў, якія суправаджалі нашых продкаў пры складанні сваіх песень. Гэтыя песні перадаюцца з пакалення ў пакаленне, таму яны захоўваюцца і адначасова набываюць штосьці новае ад кожнага пакалення.

**А.П.Грыцкевіч,**
*прафесар*

## АСВЕТНІЦКІЯ ТРАДЫЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ ў XVII—XVIII стст.

У канцы XVII ст. у Беларусі пачынаюць пашырацца ідэі ранняга Асветніцтва. Яны праявіліся ў творах С.Полацкага, І.Капіевіча, К.Лышчынскага, А.Белабоцкага. Пашырэнню асветніцкіх ідэй пазней спрыялі таксама выхаванцы Кіева-Магілянскай духоўнай акадэміі Л.Барановіч, Г.Каніскі, Ф.Пракаповіч і інш. Прадстаўнікамі Асветніцтва былі С.Шчука, К.Семяновіч [1].

Асветніцтва як грамадска-палітычная плынь актыўна пашыралася ў XVIII ст. і было падмацавана навуковымі адкрыццямі ў прыродазнаўстве і гуманітарных ведах. На тэрыторыі Беларусі меў перавагу другі кірунак. Тут асветніцкія ідэі адлюстроўвалі супярэчнасці грамадска-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай, а таксама агульную палітычную сітуацыю ў Еўропе і ва ўсходнім рэгіёне. Таму спрыяла шырокая сетка навучальных устаноў розных канфесій, і перш за ўсё Віленскі універсітэт. Пашырэнню асветніцкіх ідэй спрыяла праведзеная ў 40—50-я гг. XVIII ст. С.Канарскім рэформа піярскіх школ на тэрыторыі Рэчы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паспалітай, у тым ліку ў Беларусі. Тут былі піярскія вучылішчы і калегіумы для дзяцей розных саслоўяў ад Зэльвы і Ліды на захадзе да Віцебска і Дуброўны на ўсходзе.

У Беларусі перыяд Асветніцтва падзяляецца на два этапы. Першы этап – ранняга Асветніцтва – ад канца XVII ст. да сярэдзіны XVIII ст. Другі этап – другая палова XVIII – пачатак XIX ст. Першы этап распаўсюджвання асветніцкіх ідэй вызначаўся адлюстраваннем рэчаіснасці, побытавых і этнічных умоў жыцця розных сацыяльных груп тагачаснага грамадства, суіснавання розных пластоў у нацыянальнай культуры, прыняццем духоўнай спадчыны ў літаратуры, мастацтве і навуцы.

Першы этап Асветніцтва ў Беларусі супадаў па часе з перыядам контррэфармацыі. У галіне духоўнага жыцця гэты перыяд у адрозненне ад Рэфармацыі (якая адмовілася ад унутранага ўпрыгожання храмаў) спрыяў пышнасці і пампезнасці, уздзеянню на пачуцці вернікаў сінтэзам розных відаў мастацтва, урачыстасці богаслужэнняў.

Пануючым стылем у еўрапейскім мастацтве, у тым ліку і ў Беларусі, быў стыль барока. У беларускім мастацтве гэты стыль спалучаў як заходнееўрапейскі ўплыў, так і візантыйскія і мясцовыя традыцыі, што надавала яму пэўную своеасаблівасць. Такім чынам, у беларускай культуры існавала пераемнасць традыцый, якія панавалі ў XVI ст., з часоў Францішка Скарыны і яго паслядоўнікаў Івана Фёдарава і Пятра Мсціслаўца. Стыль барока выкарыстоўваўся не толькі ў рымска-каталіцкім асяроддзі, але і ў пратэстанцкім, уніяцкім і праваслаўным, перш за ўсё ў архітэктуры, выяўленчым мастацтве, літаратуры, музыцы. Як адзначаў Д.С.Ліхачоў, барочны стыль пераступаў сацыяльныя і нацыянальныя бар’еры і шмат у чым быў стылем надкласавым і інтэрнацыянальным [2].

Другі этап Асветніцтва ў Беларусі прыпадае на другую палову XVIII — пачатак XIX ст. Гэты перыяд характарызуецца грамадска-палітычнымі зменамі ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі, як і ва ўсёй Рэчы Паспалітай: спробы эканамічных і сацыяльных рэформаў, інтэрвенцыя суседніх дзяржаў, скіраваная на спыненне рэформаў, недапушчэнне стварэння парламенцкага ладу кіравання і рынкавага шляху развіцця краіны і, урэшце, ліквідацыя самой дзяржавы і падзел яе тэрыторыі трыма суседнімі дзяржавамі – Расіяй, Прусіяй, Аўстрыяй.

Гэтыя бурныя падзеі ўплывалі на развіццё філасофскай, гістарычнай, палітычнай думкі, спрыялі далейшаму развіццю навукі, у тым ліку і гістарычнай. У дадзены перыяд назіраецца адраджэнне паэзіі, ствараюцца прыдворны, магнацкі і школьны тэатры, шматлікія музычныя калектывы, павялічваецца колькасць бібліятэк, пачынаюць выдавацца першыя газеты, пашыраюцца кнігадрукаванне і картаграфія. Асвета ўпершыню ў Еўропе становіцца справай дзяржаўнага значэння ў выніку дзейнасці Адукацыйнай камісіі, па сутнасці першага міністэрства асветы, з шырокай сеткай школ. Усё гэта працягвала асветніцкія традыцыі, якія набылі новы характар.

Ідэі Асветніцтва пранікаюць як у асяроддзе шляхты, так і мяшчан. Ва універсітэтах вучацца не толькі дзеці магнатаў і шляхты, але і буржуазіі. Яны добра ведалі замежныя мовы. Так, сын слуцкага купца Ануфрый Сухазанет у другой палове XVIII ст. скончыў Кёнігсбергскі універсітэт, затым (як праваслаўны па веравызнанні) быў радцам епіскапа слуцкага, а потым мінскага Віктара (Садкоўскага). У гараджан былі свае бібліятэкі. Напрыклад, стараста праваслаўнага царкоўнага брацтва ў Слуцку і сябра гарадскога магістрата Іван Скачкевіч у 1678 г. завяшчаў брацтву ўсе кнігі: беларускія, польскія і лацінскія. Таксама сябра слуцкага магістрата Дзям'ян Ладыжка, багаты купец, у 1746 г. завяшчаў свайму сыну польскія, беларускія і лацінскія кнігі [3].

У XVIII ст. разам з Віленскім універсітэтам і калегіумамі ў гарадах Беларусі немалую ролю ў адукацыі адыгрывала і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кіеўская акадэмія. Яна была заснавана ў 1632 г. у Кіеве і месцілася ў адным з будынкаў Кіева-брацкага манастыра. Да 1701 г. называлася Кіева-брацкім калегіумам.

У 1701 г. паводле указа цара Пятра І яна атрымала правы і назву Кіеўскай акадэміі, або па-старому Кіева-Магілянская акадэмія ў гонар кіеўскага мітрапаліта Пятра Магілы. Да дзвюх трацін студэнтаў атрымоўвалі ў ёй свецкую адукацыю, каля траціны – духоўную. Частка святароў у Беларусі, асабліва ва ўсходніх раёнах, якія займалі высокія пасады ў царкоўнай іерархіі, былі выпускнікамі Кіеўскай акадэміі. Такім чынам, не толькі Віленскі універсітэт з шырокай сеткай калегіумаў, замежныя універсітэты ў Еўропе, але і Кіева-Магілянская акадэмія рыхтавалі адукаваных людзей і для Беларусі. І хоць праваслаўнага насельніцтва ў Беларусі ў XVIII ст. было мала (яно складала ў канцы XVIII ст. толькі 6,5%), аднак і ў яго асяроддзі было шмат адукаваных людзей сярод духавенства і мяшчанства, якія былі знаёмыя не толькі з гуманітарнымі навукамі, але і ведалі мовы. Гэта былі ў асноўным купцы і прадстаўнікі духавенства, што скончылі Кіева-Магілянскую акадэмію. Так, епіскап беларускі Георгій Каніскі ў 1767 г., адчыняючы пасяджэнне Слуцкай шляхецкай пратэстанцка-праваслаўнай канфедэрацыі, выступіў з прамовай на лацінскай мове [4]. Выпускнікі Кіева-Магілянскай акадэміі ведалі таксама польскую, нямецкую, французскую, лацінскую, грэчаскую, стараяўрэйскую мовы.

Ідэі Асветніцтва паўплывалі і на становішча рымска-каталіцкага касцёла ў Беларусі і Літве. Як адзначалася, ксёндз Станіслаў Канарскі правёў школьную рэформу, звярнуўшы ўвагу на грамадскае і палітычнае выхаванне моладзі. Праводзілася таксама рэформа з мэтай павышэння маральнага і інтэлектуальнага ўзроўню, у асноўным духавенства, асабліва парафіяльнага. Услед за піярскім ордэнам і прадстаўнікі езуіцкага ордэна звярнулі больш увагі на выкладанне ў школе прыродазнаўчых навук і філасофіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод прадстаўнікоў езуіцкай школы вылучаўся выдатны астраном Марцін Пачобут-Адляніцкі, рэктар Віленскай галоўнай школы (універсітэта). Вялікі ўклад у гуманітарныя навукі зрабіў дзеяч Асветніцтва Адам Станіслаў Нарушэвіч, паэт і гісторык, сакратар пастаяннай рады (урада) у 1782—1786 гг., біскуп смаленскі, прыхільнік дзяржаўных рэформаў у час чатырохгадовага сойма 1788—1792 гг.

Такім чынам, асветніцкія ідэі ў Беларусі, асабліва пашыраныя ў другой палове XVIII ст., былі працягам асветніцкіх традыцый XVI ст., часоў Францішка Скарыны і яго паслядоўнікаў. Яны арганічна ўбіралі ў сябе як заходнееўрапейскія ўзоры, так і мясцовыя культурныя дасягненні. Гэтыя ідэі адлюстроўваюць намаганні да пазнання свету самастойна адукаванай асобы і новай арганізацыі грамадскага, палітычнага і гаспадарчага жыцця краіны шляхам адпаведных рэформаў і развіцця тэхнікі. Асветніцкія ідэі XVII—XVIII стст. праяўляліся ў розных галінах навукі, культуры, публіцыстыкі.

---

1. *Мальдзіс А.І.* На скрыжаванні славянскіх традыцый. – Мн.: Навука і тэхніка, 1980. – С.31.

2. *Лихачев Д.С.* Развитие русской литературы X—XVII веков. Эпохи и стили. – Л.: Наука, 1973.—С.171.

3. *Грицкевич А.П.* Книжное дело в феодальном Слуцке в XVI—XVIII вв.// Вопросы библиографоведения и библиотековедения. – Мн.: Изд-во БГУ, 1983. – Вып.4. –С.57.

4. *Грыцкевіч А.П.* Рэлігійнае пытанне і знешняя палітыка царызму перад падзеламі Рэчы Паспалітай // Весці АН БССР. – 1973. Сер. грамад. навук. — № 6.— С.69.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ